## 2024 г. – 110 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Кірылавіча Букрабы (1914-1977), удзельніка Кобрынскага (Навасёлкаўскага) узброенага выступлення сялян 1933 г., ветэрана Вялікай Айчыннай вайны



Аляксандр Кірылавіч Букраба нарадзіўся ў 1914 годзе ў в. Навасёлкі Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям'і. Працаваў на зямлі, вызначаўся актыўнай жыццёвай пазіцыяй.

З жніўня 1933 года сяляне Кобрынскага павета пайшлі ў маёнтак паноў Малачэўскіх (в. Булькова), каб тыя заплацілі за палявыя работы. Па дарозе да месца збору разграмілі некалькі сядзіб асаднікаў. Больш за 100 сялян, узброеных паляўнічымі стрэльбамі і наганамі, некалькі гадзін трымалі ў асадзе паліцэйскі ўчастак у Навасёлках. Раніцай 4 жніўня паліцыя, атрымаўшы падмацаванне з Брэста, разагнала сялян.

Арганізатары выступлення былі арыштаваны, аддадзены пад ваенна-палявы суд. Аляксандр Букраба, як адзін з актыўных удзельнікаў выступлення, быў асуджаны на 10 гадоў турэмнага зняволення. Пакаранне адбываў у турмах Кобрына, Седльцаў, Вільні, Равіча.

У верасні 1939 года Аляксандр Букраба вярнуўся на радзіму. Працаваў сакратаром Навасёлкаўскага валаснога выканкама, у 1940–1941 гадах – дырэктарам школы.

У Вялікую Айчынную вайну Аляксандр Букраба – партызан атрада імя А. В. Суворава. У верасні 1942 года яго бацька Кірыл Сцяпанавіч Букраба (1884–1942) за сувязь з партызанамі быў схоплены і закатаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У жніўні 1943 года – сакавіку 1944 года Аляксандр Букраба – камісар атрада імя Г. К. Арджанікідзе брыгады імя В. М. Молатава Пінскага злучэння. З 1944 года служыў у Польскім штабе партызанскага руху. Аляксандру Букрабе разам з Мікалаем Дорашам і іншымі было даручана выявіць у польскіх сем'ях лаяльна настроеных людзей, якія жадалі удзельнічаць у вызваленні Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Разам з многімі мясцовымі партызанамі вялі тлумачальную працу сярод польскага насельніцтва, даказвалі,

што актыўны ўдзел палякаў у вызваленні беларускіх, украінскіх, польскіх земляў наблізіць выгнанне фашыстаў з гэтых тэрыторый.

Пасля вайны Аляксандр Кірылавіч знаходзіўся на савецкай і партыйнай рабоце. Працаваў намеснікам старшыні Дзівінскага, старшынёй Дзівінскага, Пружанскага і Антопальскага райвыканкамаў, 1-м сакратаром Шарашоўскага і Пружанскага райкамаў КП(б)Б.

У сувязі з перабудовай партыйнага і гаспадарчага кіраўніцтва эканомікай (1963) пачалася рэарганізацыя краявых і абласных саветаў прафсаюзаў. Быў створаны савет прафсаюзаў па кіраўніцтву прафсаюзнымі арганізацыямі: прымысловасці, будаўніцтва, транспарту і гарадской гаспадаркі (старшыня Мікалай Дзмітрыевіч Сенькін), а таксама сельскай гаспадаркі і ўстаноў, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку. Яго старшынёй быў абраны А. К. Букраба. Да 1965 года гэтыя саветы былі зноў аб'яднаны ў абласны савет прафсаюзаў (аблсаўпраф). З верасня 1965 года і да выхаду на пенсію (1975) – старшыня парткамісіі пры Брэсцкім абкаме КПБ.

За баявыя і працоўныя заслугі А. К. Букраба ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам ПНР «Віртуці Мілітары» («Залаты крыж»), медалямі.

А. К. Букраба памёр ў 1977 годзе, пахаваны ў г. Брэсце.

Звесткі пра Аляксандра Кірылавіча Букрабу і яго бацьку Кірыла Сцяпанавіча Букрабу, уяўляючы сабой прыклад патрыятызму, мужнасці і нязломнай стойкасці ў барацьбе за будучыню сваёй Радзімы, сёння служаць выхаванню будучага пакалення ў Навасёлкаўскай сярэдняй школе, у якой працуе гісторыка-краязнаўчы музей. Некаторыя эпізоды з жыцця А. К. Букрабы можна знайсці ў кнізе Уладзіміра Літвінчука «Там, за Днепра-Бугам» (2008).

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Букраба Аляксандр Кірылавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 214-215 : фат. - (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

**Букраба Аляксандр Кірылавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 252. - (Яны прайшлі дарогамі вайны).

**Дронец, А. В**. Навасёлкаўскае ўзброенае выступленне сялян 1933 г. / А. В. Дронец // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 109-113. - (У складзе Польшчы).

**Кобрынскае** выступленне сялян 1933 // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1999. - Т. 8. - С. 369.

**Кобрынскае** ўзброенае выступленне сялян 1933 // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1972. – Т. 6. – С. 44.

**Кобрынскае** выступленне сялян 1933 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1997. - Т. 4. - С. 219.

**Барысюк, Ю.** Навасёлкаўскае ўзброенае выступленне сялян 1933 года / Юрый Барысюк // Загароддзе-3 : матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі «Палессе ў XX ст.», 1-4 чэрвеня 2000 г., Беласток. – Мінск, 2001. – С. 165-168.

**Ласковіч, В. П.** Узброенае выступленне сялян у вёсцы Навасёлкі / В. П. Ласковіч // У суровыя гады падполля : [зборнік]. – Мінск, 1958. - С. 230–235.

**Литвинчук, В. А**. Там, за Днепро-Бугом / Владимир Литвинчук. – 3-е изд., испр. и доп. - Брест : ОАО «Брестская типография», 2008. – 492 с. : фот.

См на с. 259.

**Мацко, А. Н.** Вооружённое выступление крестьян Кобринского повета в 1933 г. / А. Н. Мацко // Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма (1933–1939) / А. Н. Мацко. - Минск, 1963. - С. 113–119.

**Ардэнаносцы. Букраба Аляксандр Кірылавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 36 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**110 гадоў** з дня нараджэння А. К. Букрабы (1914) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 116-117.

**З гісторыі** роднага краю ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў (1939–1945) : (на ўшанаванне памяці жыхароў в. Навасёлкі – удзельнікаў мінулай вайны, загінуўшых або пацярпеўшых у гады змагання з ворагам) / група экскурсаводаў школьнага гісторыка-краязнаўчага музея, кіраўнік – настаўнік гісторыі Дронец Аляксандр Вячаслававіч. – Навасёлкі, 2010. – 192 с.

**Кароткія** біяграфічныя звесткі пра Аляксандра Кірылавіча Букрабу : матэрыял падрыхтаваны для гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць Кобрынскі раён») / настаўнік гісторыі Навасёлкаўскай СШ А. В. Дронец // Гісторыя в. Навасёлкі. - Навасёлкі, 1998.

**Навумчык, М**. «Гарачая кропка» жніўня 1933 года – Вялікі Паўлопаль / Мікалай Навумчык // Голас часу. Маларыта. - 2023. - 18 кастрычніка. - С. 4.

**Белов, Д.** Забвению вопреки / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2015. - 4 лютага. - С. 4.

Об Александре Букраба, участнике Новоселковского крестьянского восстания 1933 г., в годы Великой Отечественной - комиссаре отряда им. Орджоникидзе Пинской бригады.

**Бялоў, Д.** Сялянскі бунт : Навасёлкаўскае паўстанне на Кобрыншчыне 1933 г. / Дзмітрый Бялоў / Народная трыбуна. - 2009. - 12 верасня. - С. 10.

Кобрынскі раён
Навасёлкі
Кобрынскае выступленне сялян 1933
Букраба Аляксандр Кірылавіч
Удзельнікі рэвалюцыйнага руху
Партызаны
Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны